# Скарына Алега Янкоўскага і "тусоўка" 500-гадовых. Як першадрукара ўвасаблялі ў помніках і ў кіно

Як у кожнага вялікага чалавека, пасля смерці ў Францыска Скарыны пачалося другое жыццё, не менш насычанае за першае. Пуцёўку ў вечнасць першадрукар атрымаў у тым ліку дзякуючы прадстаўнікам творчых прафесій, якія рабілі яго героем сваіх твораў. TUT.BY разам з **Банкам БелВЭБ** згадаў, у якіх беларускіх і замежных гарадах стаяць помнікі першадрукару і якія прыгоды былі звязаны з іх устаноўкай, як Алег Янкоўскі сыграў Скарыну ў кіно, а таксама ў якіх двух беларускіх гарадах можна ўбачыць гісторыю жыцця знакамітага палачаніна на тэатральнай сцэне.


Графіка Ляілі і Валянціна Варэцы

## «Пастамент помніка трэснуў за тыдзень да адкрыцця»

Першы помнік Францыску Скарыне на тэрыторыі Беларусі натуральна з'явіўся ў яго родным Полацку. Піянерам «скарыніяны» у скульптуры стаў Аляксей Глебаў, будучы народны мастак Беларусі. На яго рахунку ажно тры працы, прысвечаныя першадрукару. Адразу пасля вайны, у 1946-м, ён зрабіў з гіпсу невялікую мадэль, якую пазней адлілі ў бронзе. На ёй Скарына трымаў у руцэ глобус. У 1954-м – драўляную статую знакамітага палачаніна (абедзьве працы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі). Напрыканцы 1960-х, ужо перад смерцю Глебаў выканаў мадэль помніка, якая ў 1974-м была ўсталявана ў Полацку яго вучнямі Ігарам Глебавым і Андрэем Заспіцкім. Вышыня бронзавага помніка склала 12 метраў, вышыня самой

скульптуры – 5,5 метра. За яго Глебаў пасмяротна быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР.



Помнік у Полацку. Фота: Сяргей Балай, TUT.BY

Другі помнік павінен быў паўстаць у Мінску. У 1990 годзе спаўнялася 500 год са дня нараджэння Скарыны (меркавалася, што ён з’явіўся на свет каля 1490 года). Папярэдне ў беларускай сталіцы быў аб'яўлены конкурс на лепшы праект помніка. Пераможцам стаў скульптар Алесь Дранец. Помнік, створаны паводле яго праекту, адлілі ў бронзе. Але ўсталяваць насупраць Акадэміі навук, дзе папярэдне меркавалася, не змаглі. Тагачаснае кіраўніцтва акадэміі было катэгарычна супраць любой скульптуры, якая нібыта псавала архітэктурны ансамбль.



Помнік у Мінску. Фота: minsk-old-new.com

На пэўны час пра працу Дранца забыліся. Але калі ў 2005 годзе ля метро «Усход» адкрыўся новы будынак Нацыянальнай бібліятэкі, першадрукар быў усталяваны каля яе.

Затое ў Лідзе чакаць не сталі. Адкрыць помнік Скарыне ў пачатку 1990-х гадоў прапанавала гарадская арганізацыя «Таварыства беларускай мовы».



Помнік у Лідзе. Фота: Герман Сачук, TUT.BY

Праект стварыў скульптар Валяр’ян Янушкевіч, а непасрэдна ўстаноўкай помніка займаўся архітэктар Рычард Груша. У інтэрв'ю «Радыё Свабода» ён расказваў, як за тыдзень да ўсталявання трэснуў пастамент і давялося ехаць ва Украіну і замаўляць новы. На адкрыццё прыехаў тагачасны міністр замежных спраў Пётр Краўчанка, а таксама беларусы з Аўстраліі. Гэта быў першы адкрыты помнік у незалежнай Беларусі.

Пазней эстафету падхапіў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Пляцоўкай для помніка стаў унутраны дворык, які знаходзіцца паміж галоўным корпусам, будынкамі некалькіх факультэтаў і рэктарата.


Помнік Скарыне на тэрыторыі БДУ. Фота: bygeo.ru

У 1999 годзе там была ўшанавана памяць святой Ефрасінні Полацкай, аўтара «Песні пра зубра» Міколы Гусоўскага і Францыска Скарыны. Пазней да іх пачэснай кампаніі далучыліся скульптуры філосафа і асветніка Сымона Буднага, пісьменніка, асветніка і перакладчыка Васіля Цяпінскага, а таксама святога Кірылы Тураўскага. Самым маладым у гэтай суполцы – 500 гадоў, самым старэйшым – каля 900. Дарэчы, аўтарам помніка Скарыне стаў айчынны скульптар Сяргей Адашкевіч. Дзякуючы яго працы з'явілася цікавая студэнцкая традыцыя: перад іспытам трэба падысці да Скарыны і папрасіць у яго «ясную галаву» на іспыце і добрай адзнакі. Кажуць, дапамагае.

## Перад эміграцыяй у Прагу – пяць гадоў на гаспадарчым двары


Помнік Францыску Скарыне ў Празе. Фота: з асабістага архіва Эдуарда Астаф’ева

У 1990-я гады скульптуры Скарыны з’явіліся за межамі Беларусі. Конкурс на стварэнне манумента беларускаму першадрукару ў Празе быў аб'яўлены яшчэ ў пачатку 1990-х. Перамог праект Эдуарда Астаф’ева. Помнік быў створаны яшчэ ў 1991 годзе, калі існаваў СССР. У першыя гады незалежнасці ў Чэхіі не было беларускага пасольства, таму праект застаўся незапатрабаваным. Помнік Скарыне пяць гадоў стаяў на гаспадарчым двары. І толькі ў 1996 годзе дзякуючы намаганням пасла Беларусі ў Чэхіі Мікалая Вайцянкова велічэзная статуя (помнік з п’едэсталам складае больш за 2,5 метра ў вышыню) была ўсталявана на краю Градчан – аднаго з гістарычных раёнаў Прагі.


Помнік Скарыне ў Калінінградзе. Фота: bygeo.ru

У 2005 годзе помнік Скарыне з'явіўся яшчэ ў адным замежным горадзе – Калінінградзе (колішнім Кёнігсбергу). У 1530 годзе друкар прыехаў туды, каб паступіць на службу да герцага Альбрэхта і заснаваць тыпаграфію. Але неўзабаве вярнуўся ў Вялікае княства Літоўскае. Прычым прыхапіўшы двух мясцовых спецыялістаў, што вельмі ўзлавала герцага. Скульптура Анатоля Арцімовіча была ўсталявана ў двары Калінінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Цікава, што ў старажытнай Вільні (сучасным Вільнюсе), дзе Скарына друкаваў свае кнігі, асобнага помніка яму няма. Праўда, яшчэ ў 1973 годзе ў двары дома № 4 на вуліцы Stikliu, дзе ў 16 стагоддзі мясцілася друкарня Скарыны, а пазней – братоў Мамонічаў, быў усталяваны помнік «Летапісец».


Помнік «Летапісец». Фота: vilnia-by.com

Ён прысвечаны Скарыне, а таксама Івану Фёдараву і Пятру Мсціслаўцу, якія распачалі кнігадрукаванне ў Беларусі, Украіне і Расіі. Менавіта ў гэтай друкарні з'явіліся на свет легендарныя Скарынавы «Малая падарожная кніжка» (1522) і «Апостал» (1525), а пазней «Трыбунал» (1586) і «Трэці статут ВКЛ» (1588) – галоўныя заканадаўчыя дакументы Вялікага Княства Літоўскага.

Дарэчы, неўзабаве ў свеце з'явіцца яшчэ адзін помнік нашаму першадрукару. Рашэннем ураду Малдовы і мэрыі муніцыпія Кішэнёў ён будзе ўсталяваны ў скверы насупраць беларускага пасольства. Вышыня помніка, аўтарам якога стане скульптар Генадзь Лойка, складзе амаль 1 метр, агульная вышыня (з пастаментам) – крыху больш за 2,5 метра. Выдаткі на распрацоўку праектнай дакументацыі для помніка, выкананне работ і ўстаноўку пастамента і бюста, а таксама добраўпарадкаванне прылеглай тэрыторыі будуць пакрытыя за кошт фінансавых сродкаў Беларусі і спонсарскай дапамогі.

### Як браты Янкоўскія сталі братамі Скарынамі

Францыску Скарыне не вельмі пашанцавала з кіно. Першы дакументальны фільм пра яго з'явіўся толькі ў 1963 годзе, калі на Мінскай студыі навукова-папулярных і хроніка-дакументальных фільмаў была створана стужка

«Георгій Скарына» (у савецкія часы першадрукара памылкова называлі Георгіем). Дакументальныя стужкі з'яўляліся пра яго і пазней. А вось мастацкі фільм пакуль вядомы толькі адзін. У 1970 годзе на экраны выйшаў фільм «Я, Францыск Скарына», зняты паводле рамана Міколы Садковіча і Яўгена Львова «Георгій Скарына».
Пісьменнікі пачалі працаваць над кнігай напрыканцы Другой сусветнай вайны. Адна за адной паслядоўна выходзілі тры часткі (апошняя – у 1956 годзе). Аўтары ідэалізавалі Скарыну, які паўставаў ледзь не чалавекам без заганаў і патрыётам роднага краю. Рэжысёр Барыс Сцяпанаў, які дагэтуль зняў «Альпійскую баладу» паводле аднайменнага твора Васіля Быкава, запрасіў на здымачную пляцоўку двух братоў. Першадрукара іграў Алег Янкоўскі, яго брата Івана – Расціслаў Янкоўскі. Сярод акцёраў была і знакамітая Стэфанія Станюта. Стваральнікаў стужкі крытыкавалі за пэўную гістарычную недакладнасць, меладраматызм асобных сцэн і празмерную ўвагу да асабістага жыцця. Хоць вобраз Скарыны – абаяльнага, разумнага і свабодалюбівага чалавека – стаў поспехам Алега Янкоўскага.

Той фільм выйшаў у 1970 годзе, але іншых мастацкіх стужак так і не з'явілася. Кінематаграфістаў не натхніў і раман Алега Лойкі «Францыск Скарына, або Сонца маладзіковае», які ў 1989 годзе выйшаў на рускай мове ў папулярнай серыі «Жыццё знакамітых людзей». Гэта было агульнасаюзнае прызнанне. Як пісала даследчыца Ганна Навасельцава, Лойка «аб'яднаў у мастацкае цэлае навуковы пошук і вымысел, адлюстраванне гістарычных фактаў і пісьменніцкія гіпотэзы. Скарына паўстае тытанам Адраджэння».



Фота мае ілюстрацыйны характар. Фота: Сяргей Балай, TUT.BY

Не вельмі Скарыне пашанцавала і ў тэатры. У 1925 годзе пісьменнік Міхайла Грамыка напісаў першую п'есу пра першадрукара: «Скарына – сын з Полацка». Яе паставілі ў БДТ-1 (цяперашні Купалаўскі тэатр). Але далей адбылася трагедыя: здзейсніўся ўсяго адзін паказ, а рукапіс, які перадалі ў Акадэмію навук, згубіўся. Сам аўтар, які зведаў рэпрэсіі, так і не змог яе аднавіць. Праз гады ён згадаў толькі некалькі радкоў: «На вежы выбіла чатыры, а доктара ўсё няма з друкарні… І ўчора так, і сёння – кожны дзень!»

П'есу «Георгій Скарына», якую напісаў Міхась Клімковіч (аўтар слоў да гімна «Мы, беларусы…»), уключылі ў план Купалаўскага тэатра на 1946/1947 год, але так і не паставілі. Пазней п'еса ператварылася ў драматычную трылогію. Паводле яе сваячка творцы, Святлана Клімковіч, напісала лібрэта, а кампазітар Дзмітрый Смольскі – оперу «Францыск Скарына» (1980). Але да сцэны апошняя таксама не дайшла.

Крыху больш пашанцавала драматургу Алесю Петрашкевічу. Сваю ролю сыграла і яго пасада: творца пэўны час з'яўляўся загадчыкам аддзела культуры ЦК КПБ. П’есу «Напісанае застаецца» паставілі ў Гродненскім драматычным (1978) і ў Купалаўскім тэатрах (1979). У апошнім ролю Скарыны сыгралі Віктар Тарасаў і Уладзімір Рагаўцоў. А вось яго ж п’еса «Прарок для Айчыны» (1990) ужо не мела такога поспеху.

У 1990-я, ужо пасля распаду СССР, вобраз Скарыны стаў інтэрпрэтавацца больш вольна. Так, у спектаклі Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі «Vita brevis, або Нагавіцы святога Георгія» (п'еса Максіма Клімковіча і Міраслава Адамчыка) Скарына станавіўся фрывольным фарсавым персанажам і аматарам любоўных прыгод. Напрыклад, сцэна яго дыспута з Мартынам Лютэрам была паказана праз стасункі палачаніна з жонкай апошняга.


Сцэна са спектакля «Кар'ера доктара Раўса». Фота: архіў Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі

Ужо ў наш час дадатковым штуршком да развіцця тэатральнай скарыніяны стаў конкурс п'ес «Францыск Скарына і сучаснасць», які быў аб'яўлены ў мінулым годзе. Аўтары прапанавалі журы 32 твора, прычым некаторыя з іх ужо пастаўлены на сцэне. Так, п'еса Віктара Марціновіча «Кар'ера доктара Раўса» ідзе на сцэне Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі. А п'есу «Доктар свабодных навук» Мікалая Рудкоўскага паставілі ў Магілеўскім драматычным тэатры (назва пастаноўкі лаканічная – «Скарына»).

Пакрысе ў беларускай культурнай прасторы Скарыны становіцца ўсё больш і больш. Як кажуць, гэта яшчэ не мяжа. Скарына – той чалавек, які аб'ядноўвае ўсіх беларусаў. А значыцца, новыя творы пра Скарыну і помнікі, прысвечаныя яму, не прымусяць сябе чакаць.